# Зьезд Крывіцкага Навуковага Таварыства Пранціша Скарыны

2 студзеня сёлета ў Остэргофэне адбыўся зьезд Крывіцкага Навуковага Таварыства Пранціша Скарыны. Рэфэрат на тэму „З часоў «Нашае нівы», людзі й іхная дзейнасьць“ прачытаў на зьезьдзе праф. др. Я. Станкевіч. У дыскусіі рэфэрат дапоўнілі ўчасьнікі зьезду некаторымі цікавымі ведамкамі. Пасьля справаздачы з працы Т–ва за мінулы год быў разгледжаны й прыняты плян працы на наступны год. Кажны ўчасьнік зьезду заявіў — і гэта было запратакулавана — якую тэму ён апрацуе сёлета. Зацемім, што згодна із статутам заданьнем Т–ва ёсьць як навуковыя дасьледаваньні, так і папулярызацыя веды. Зьезд пастанавіў зьвярнуцца да ня прыбылых на зьезд сяброў Т–ва, каб яны прыслалі прэзыдыюму тэмы сваіх сёлетніх працаў. Зьезд пастанавіў заняцца зьбіраньнем матэрыялаў этнаграфічных, зь беларускага адраджэнскага руху й зь беларускага мучаніцтва. Дзеля гэтага будуць апрацаваныя й выданыя адпаведныя апытальнікі. У сувязі зь менаваным зьезд даручыў прэзыдыюму Т–ва зьвярнуцца да старшых выдатнейшых грамадзян беларусаў, каб яны пісалі свае жыцьцяпісы — успаміны, у якіх–бы апісалі як сваё собскае жыцьцё, так і падзеі, у якіх прыймалі ўдзел — усё маючае якое–колечы значаньне для гісторыі беларусага адраджэнскага руху й цікавае для будучых пакаленьняў. На заканчэньне зьезд прыняў у Таварыства некалькі новых сяброў.

# „Літоўская плынь“ у нацыянальным адраджэньні беларускага народу

Беларуская гаспадарстваваасьць ведамая не пазьней, як із IX ст. па Хрысту. Да палавіны XIII стагодзьдзя было колькі беларускіх гаспадарстваў, зь іх найважнейшыя Полацкае, Смаленскае, Северскае й Пскоўскае, а з пал. XIII ст. ёсьць адно задзіночанае гаспадарства нашага народу, ведамае на ўвесь сьвет пад назовам Вялікага Княства Літоўскага або Літвы, што трывала да канца XVIII ст. Гэткім парадкам, на 11 з палавінаю стагодзьдзяў гістарычнага быцьця нашага народу 10 стагодзьдзяў прыпадае на ягонае жыцьцё гаспадарстваваe і толькі апошніх 150 год на быцьцё безгаспадарстваваe. З усіх народаў, паняволеных маскоўскай дэспотыяй, гаспадарстваваасьць беларускага народу была найвыдатнейшая. Казацкая гаспадарстваваасьць украінцаў XVII—XVIII ст. ня можа раўняцца зь ёю. Польская гаспадарстваваасьць можа раўняцца да гаспадарстваваасьці беларускай, але ёсьць мамэнты, калі гэная ўступае нашай. Прыкладам, папулярнага „ад мора да мора“ ў палякаў ніколі ня было, але беларускае гаспадарства ад пал. XIV да XVI ст. прасьцягалася ад Балтыцкага да Чорнага мора.

Няма дзіва, што такая доўгая гаспадарстваваая традыцыя мусіла адбіцца на жыцьці й імкненьнях беларускага народу пасьля ўтраты ім свайго гаспадарства, дарма што гэтая ўтрата прыпала ў пару нашага палітычнага й культурнага ўпадку. Але гэны ўпадак ня быў такі вялікі, як шмат каму цяпер здаецца. Быў ён вялікі, калі прыраўнаваць жыцьцё нашага народу часу сходу ў XVIII ст. да красуючага жыцьця ягонага ў ст. XVII; аднак ня